**Маціеўскі, М.** У горных цяснінах / М. Маціеўскі // Сцяг Ільіча (Талачын). — 2000. — 22 сак. — С. 2.

## У ГОРНЫХ ЦЯСНІНАХ

З Сяргеем Шастаком мы сустрэліся адразу ж пасля яго вяртання з рэспубліканскага рэабілітацыйнага цэнтра для былых воінаў-інтэрнацыяналістаў.

– Выдзелілі мне ў нашым аб'яднанні воінаў-афганцаў сямейную пуцёўку. Добра паправілі здароўе, адпачылі. Мае ўсе баявыя саратнікі вельмі ўдзячныя тым, хто стварыў такі цэнтр для нас. Асабліва ён неабходны для тых, хто меў раненні, цяжкія кантузіі. Я таксама быў паранены ў адным з баёў, давялося некалькі праляжаць у шпіталі. Затым зноў у строй...

У Афганістан малодшы сяржант Сяргей Шастак трапіў у снежні 1986 года. Быў камандзірам БТРа. Часцей за ўсё яму разам з сябрамі даводзілася знаходзіцца ў засадах на малапрыкметных горных сцяжынках, дзе праходзілі караваны са зброяй, медыкаментамі, харчаваннем для душманскіх банд. Савецкія воіны заўсёды знянацку паўставалі перад мяцежнікамі. і тады завязваўся жорсткі, кровапралітны бой. І нашы байцы часцей за ўсё выходзілі пераможцамі, "духі" неслі вялікія страты...

Па дарогах Афганістана Сяргей пераадолеў не адну сотню кіламетраў. Не наездзіў, як прынята казаць у мірным жыцці. а менавіта пераадолеў. Там і кіламетра роўнага не знойдзеш. То даводзілася з цяжкасцю ўзбірацца ўгору, то скочвацца ўніз, не шкадуючы тармазоў, то ныраць углыб цяснiны. І паўсюдна магла аказацца міна, падкладзеная душманамі, з-за кожнага выступу скалы або дувала мог прагучаць выстрал.

У многіх баях давялося ўдзельнічаць Сяргею Шастаку, але найбольш запомніўся апошні.

Гэты варожы караван быў самым вялікім з тых, якія даводзілася бачыць Сяргею. І, мяркуючы па той шматлікай ахове, ён быў надта важным для мяцежнікаў. Засады вораг, як заўсёды, у гэтым месцы не прадбачыў. Савецкія воіны адкрылі шквальны агонь. Але і іх чакаў занадта непрыемны «сюрпрыз». Насустрач каравану з тылу нашых байцоў ішоў вялікі душманскі атрад. Бой працягваўся паўтара сутак. Былі страты і з нашага боку, адзін за адным ад трапных выстралаў мёртвыя падалі на зямлю «духі». На дапамогу нашым падаспела пяхота. Вораг быў знішчаны.За тэты бой наш зямляк Сяргей Шастак быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Сёння Сяргей – міліцыянер спецыялізаванай службы «Ахова». Яго хваляць. І не выпадкова. Прайшоўшы суровыя баявыя выпрабаванні, ён і цяпер такі ж дысцыплінаваны, пры неабходнасці праяўляе і мужнасць. А яшчэ Сяргей – добры муж, клапатлівы бацька дваіх дзяцей. Саша і Маша вельмі любяць бавіць час са сваім татам, з ім заўсёды цікава і весела.

А надарыцца вольная часіна – Сяргей Мікалаевіч спяшаецца на рыбалку або паляванне. Любімыя заняткі сапраўднага мужчыны. А ён менавіта такім і з'яўляецца.

**Мікола Маціеўскі**